*Ж. С. Супрун* (УА «Горацкі педагагічны каледж Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова»)

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭРАКТЫЎНЫХ МЕТАДАЎ НАВУЧАННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Анатацыя.** У артыкуле раскрыта роля інтэрактыўных метадаў і прыёмаў у павышэнні матывацыі да вывучэння беларускай літаратуры. Указаны эфектыўныя метады інтэрактыўнага навучання, якія выкарыстоўваюцца з мэтай актывізацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў.

Час патрабуе быць мабільным, камунікабельным, умець працаваць у калектыве. Задача педагога –развіваць асобу маладогачалавека, які ўступае ў жыццё, арыентавацца на патрэбы навучэнцаў іпа-новаму пераасэнсоўваць уласную дзейнасць. Таму выкарыстанне тэхналогіі інтэрактыўнага навучання – неабходная ўмовааптымальнага развіццяі тых, хто вучыць, і тых, хто вучыцца.

Праблема матывацыі да вучобы, прывіцця цікавасці да ведаў застаецца нявырашанай, хоць ёй прысвечана безліч псіхолага-педагагічных прац. Сёння навучэнец хоча на ўроку разумець матыў – тое, што натхняе, скіроўвае яго да пэўнай дзейнасці, а калі ён гэтага не бачыць, не разумее, то і не імкнецца да таго, што прапануе выкладчык. Таму важна не навязваць навучэнцу сваіх вучэбных мэт “зверху”. Мэта выкладчыка на ўроку павінна стаць мэтаю навучэнца. У сваёй практыцы даводзіцца ўлічваць і тое, што прыходзіцца працаваць увучнёўскім асяроддзі, якое пасваім складзе вельмі разнастайнае. Навучэнцы істотна адрозніваюцца па ўзроўні фізічнага, разумовага, інтэлектуальнага развіцця. На іх фарміраванне ўплывае і сацыяльнае асяроддзе, сямейна-бытавыя ўмовы. Рыхтуючыся да заняткаў, мы заўсёды ўлічваем ступень арганізаванасці, развіцця разумовых здольнасцей кожнага навучэнца.

Знаходзячыся ў пошуку вырашэння праблемы павышэння матывацыі да вывучэння беларускай літаратуры, мы звярнуліся да выкарыстання інтэрактыўных прыёмаўнавучання, апісаных у метадычнай літаратуры [1; 2; 3]. Інтэрактыўнае навучанне дае педагогу цудоўную магчымасць якасна змяніць працэс узаемадзеяння на ўроку, зрабіць яго прыцягальным для навучэнцаў, якія атрымліваюць эмацыянальны штуршок да актыўнай пазнавальнай дзейнасці на занятках і не баяцца выказаць няправільную думку. Кожны навучэнец становіцца паспяховым, а гэта,у сваю чаргу, спрыяе павышэнню станоўчай матывацыі да вывучэння прадмета.На наш погляд, інтэрактыўныя метады робяць звычайную паўсядзённасць цікавай, насычанай, даюць магчымасць навучэнцам выказваць сваё разуменне і бачан-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

не аб'екта, рабіць самастойныя вывады,спрыяюць лепшаму запамінанню, павышэнню матывацыі да навучання, стварэнню неабходных умоў для зносін, супрацоўніцтва і сумеснай творчасці, фарміруюць камунікатыўную, асабістую, сацыяльную, інтэлектуальную кампетэнцыі.

Умовай рэалізацыі дадзенага падыходу з'яўляеццаарганізацыясамас тойнагаі ініцыятыўнага дзеяння навучэнцаў у адукацыйнымпрацэсе, арыентацыя на сумесныя формы ўзаемадзеяння з педагогаму вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці.Мэтайінтэрактыўнага навучання з'яўляецца стварэнне камфортных умоў навучання, пры якіх навучэнец адчувае сваю паспяховасць, сваю інтэлектуальную дасканаласць.

Інтэрактыўныяметады – гэта сістэма правілаў арганізацыі прадуктыўнага ўзаемадзеяння навучэнцаў паміж сабой і педагогам у форме навучальных, дзелавых, ролевых гульняў, дыскусій і інш., пры якіх адбываецца засваенне ведаў.Інтэрактыўныя метады дазваляюць вырашаць наступныя задачы:

– актыўнае ўключэнне кожнага навучэнца ў навучальна-выхаваўчы працэс;

– навучанне навыкам паспяховых зносін (уменне слухаць і чуць адзін аднаго, ладзіць дыялог і інш.);

– выхаванне лідарскіх якасцей;

– уменне працаваць з камандай і ў камандзе;

– уменне прымаць на сябе адказнасць за супольную і ўласную дзейнасць для дасягнення выніку.

У сістэме інтэрактыўных метадаў шмат мадыфікацый, кожная з якіх цікавая па-свойму і прыдатная для выкарыстання. У выніку прадастаўляецца шырокае поле для творчай дзейнасці не толькі навучэнцаў, але і выкладчыкаўна кожным этапе ўрока. Гэта дапамагаезрабіць працэс навучання больш асэнсаваным, лагічна завершаным, эмацыянальна станоўча афарбаваным і як вынік – больш эфектыўным. Пры знаёмстве з тым ці іншым метадам педагог быццам "прымярае" яго да зместу свайго прадмета, асаблівасцей класа, у якім працуе, вызначае педагагічныя магчымасці кожнага канкрэтнага метаду.

Пад інтэрактыўным навучаннем трэба разумець выкарыстаннефрантальных ігрупавых форм арганізацыі вучэбнай дзейнасці, інтэрактыўных гульняў іметадаў, што спрыяюць развіццю камунікатыўных уменняў. Да найбольш распаўсюджаных сёння адносяцца наступныя:*ролевая гульня, разумовая "атака", праекты,моўныяасацыяцыі, узнаўленне інфармацыі, пошук адпаведнікаў, тэхналогія "ключавы момант", рэклама кніг, фантастычная дабаўка, паэтычны зарапад, флешбук, візуальныя карты(скетчы)* і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Інтэрактыўныя метады і прыёмы навучання сёння дастаткова папулярныя ў педагагічным асяроддзі. Можна па-рознаму да іх ставіцца, аднаквопыт выкарыстання на ўроках літаратуры пераконвае, што яны дазваляюцьпаспяхова рэалізаваць навучальныя задачы.Выкарыстанне інтэрактыўных метадаў заахвочвае педагога да пастаяннай творчасці, а значыць, да самаўдасканалення, прафесійнага росту. Настаўнік, які сам выкарыстоўваў інтэрактыўныя метады на ўроках, упэўніваецца, што яны не толькі з'яўляюцца дзейсным сродкам навучання, але і важнай умовай асобаснага развіцця навучэнцаў, садзейнічаюць развіццю ўменне наладжваць стасункі з іншымі людзьмі, камунікаваць з імі, працаваць у камандзе, ажыццяўляць свабодны выбар і прымаць самастойныя рашэнні. Гэтыя якасці вельмі неабходныя для паспяховай сацыялізацыі асобы будучага настаўніка. Безумоўна, выкарыстанне інтэрактыўныхметадаў у спалучэнні з традыцыйнымі зробіцьадукацыйны працэс цікавым і эфектыўным.

## Літаратура


1. *Бельскі, А. І.* Мэты, задачы літаратурнага навучання і інтэрактыўная творчасць / А. І. Бельскі // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 12. – С. 52–56.
2. *Жуковіч, М. В.* Фарміраванне ў школьнікаў матывацыі да навучання на ўроках беларускай мовы і літаратуры / М. В. Жуковіч // Беларуская мова і літаратура. – 2004. – № 6. – С. 3–5.
3. *Руцкая, А. В.* Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў: інтэрактыўныя метады навучання літаратуры / А. В. Руцкая, М. У. Грынько // Беларуская мова і літаратура. – 2015. – № 2. – С. 6–11.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова